# Частка I. СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ НАВЕЙШАГА ЧАСУ 1918—1945 гг.

## § 1. Свет пасля вайны

*1. Якія перыяды сусветнай гісторыі вы вывучалі ў папярэдніх класах? 2. Ахарактарызуйце змест і наступствы прамысловай рэвалюцыі. 3. Чаму пачалася Першая сусветная вайна?*

XX ст. складае асаблівую эпоху сусветнай гісторыі. Гэта эпоха характарызуецца імклівым развіццём усіх сфер жыцця чалавека і грамадства. На вачах трох пакаленняў адбыліся надзвычайныя перамены. Працэс развіцця асобных цывілізацый і рэгіёнаў набываў усё болей агульных рыс. Людзі ўпершыню па-сапраўднаму сталі ўсведамляць, у якім узаемазалежным і крохкім свеце яны жывуць. Стагоддзе развіцця розуму і навукі было таксама стагоддзем войнаў, рэвалюцый і сацыяльных узрушэнняў.

**Паняцце «навейшая гісторыя» і яе перыядызацыя.** ***«Навейшая гісторыя»***, або ***«гісторыя Навейшага часу»***, цяпер разглядаецца як пераход ад індустрыяльнага грамадства да постіндустрыяльнай інфармацыйнай эпохі. Гэты складаны і супярэчлівы працэс ахоплівае амаль усё XX ст. і пачатак XXI ст.

Межавой падзеяй паміж новай і навейшай гісторыяй стала *Першая сусветная вайна*. Яна была яскравай праявай крызісу еўрапейскай цывілізацыі.

У гісторыі Навейшага часу можна вылучыць два адносна самастойныя перыяды. Першы ахоплівае ***1918—1945 гг.*** Гэта перыяд уздыму рэвалюцыйных рухаў у Еўропе і нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў краінах Азіі і Афрыкі. Адначасова абвастрыліся супярэчнасці паміж найбуйнейшымі дзяржавамі свету, што прывяло да самай разбуральнай у гісторыі чалавецтва сусветнай вайны 1939—1945 гг.

Другі перыяд пачынаецца з ***1945 г.***, пасля заканчэння ***Другой сусветнай вайны***. Ён характарызуецца супрацьстаяннем дзвюх звышдзяржаў — ЗША і СССР, капіталістычных і сацыялістычных краін. Прамога сутыкнення паміж імі, на шчасце, не адбылося. Аднак маштабнае супрацьстаянне завяршылася распадам СССР і таго сусветнага парадку, які склаўся ў выніку Другой сусветнай вайны. Пачаўся працэс пашырэння на ўвесь свет эканамічнай, палітычнай і культурнай *інтэграцыі*, г. зн. збліжэння, аб'яднання і ўзаемазалежнасці асобных краін і рэгіёнаў. Гэты працэс

Правообладатель Издательский центр БГУ



Канвеерная вытворчасць на заводзе Форда. У 1913 г. Г. Форд запусціў першы ў свеце аўтамабільны зборачны канвеер, што прывяло да павышэння эфектыўнасці вытворчасці

атрымаў назву ***глабалізацыі***. Актыўную і ключавую ролю ў ім адыгрывалі і працягваюць адыгрываць ЗША і іншыя краіны Захаду.

**Краіны Захаду: асноўныя тэндэнцыі развіцця.** У першай палове XX ст. Заходняя Еўропа і ЗША былі ахоплены імклівай індустрыялізацыяй. Дзякуючы дасягненням навукі вырашальнае значэнне ў эканоміцы сталі мець новыя тэхналогіі і тэхніка.

Найбуйнейшыя краіны свету ўступілі ў перыяд індустрыяльнага грамадства. Нягледзячы на нацыянальныя адрозненні, у іх гістарычным развіцці можна вылучыць агульныя рысы. Гэта перш за ўсё перавага прамысловай прадукцыі ў агульным нацыянальным даходзе; фарміраванне адносна ўстойлівай палітычнай сістэмы; станаўленне палітычных арганізацый і грамадскіх рухаў, незалежных ад дзяржаўнага апарату; бесперапыннае павелічэнне долі гарадскіх жыхароў; адносна высокі ўзровень пісьменнасці насельніцтва.

На мяжы XIX—XX стст. развітыя краіны свету ўступілі ў эпоху імперыялізму. Дзяржава паступова станавілася актыўным удзельнікам і рэгулятарам эканамічнага жыцця. Яна рашуча праводзіла пратэкцыянісцкую палітыку, вяла гандлёвыя войны, выступала сузаснавальніцай гандлёвых кампаній і найбуйнейшым заказчыкам у галіне ўзбраенняў.

Узрастанню ролі дзяржавы ў грамадстве спрыялі новыя міжнародныя эканамічныя сувязі, а таксама рост напружанасці ў свеце, з’яўленне тэндэнцыі да мілітарызацыі эканомікі, гонка ўзбраенняў. Захавалася і нават узмацнілася нераўнамернасць развіцця асобных дзяржаў. Такія краіны, як ЗША, Германія або Японія, дзе параўнальна нядаўна склаліся нацыянальныя дзяржавы, развіваліся хуткімі тэмпамі і імкнуліся да новага перадзелу свету.

**Наступствы Першай сусветнай вайны.** Да 1914 г. Еўропа была палітычным і культурным цэнтрам свету, месцам канцэнтрацыі ваеннай і фінансавай магут-

Правообладатель Издательский центр БГУ




Дэманстрацыя ў г. Лоўстафт (Англія) у падтрымку выбарчага права жанчын. 1914 г. У гады вайны ў Вялікабрытаніі ўпершыню пачалося масавае выкарыстанне жаночай працы, што вымусіла парламент у 1918 г. прыняць закон, які надзяліў жанчын правам голасу

насці. Гэта параўнальна невялікая частка свету кіравала велізарнымі каланіяльнымі імперыямі. Капіталізм быў пераважнай эканамічнай сістэмай. У асноўных краінах Захаду развіваліся дэмакратыя і парламенцкія ўстановы. І ўсё гэта раптоўна разбурылася з пачаткам сусветнага канфлікту. Глабальнае сутыкненне абвясціла аб пачатку перыяду, які ўвайшоў у гісторыю пад назвай «эпохі насілля».

Сусветная вайна прывяла да велізарных людскіх і матэрыяльных страт. Людзі, якія перажылі нягоды і бедствы вайны, заслужана спадзяваліся на лепшае і больш справядлівае ўладкаванне свету. Аднак неўзабаве іх ілюзіі развеяліся.

Пераможцы, якія сабраліся на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919—1920 гг., не змаглі забяспечыць народам устойлівы мір. Падпісаныя дагаворы выклікалі крыўду і абурэнне, асабліва ў Германіі і Італіі, спрыялі як эканамічнай дэпрэсіі 1930-х гг., так і выспяванню перадумоў для новай сусветнай вайны. Міжнародная арганізацыя ***Ліга Нацый***, створаная дзяржавамі-пераможцамі для прадухілення ваенных канфліктаў, не мела ні дастатковай сілы, ні падтрымкі для таго, каб гарантаваць мір і бяспеку ў неспакойныя 1930-я гг.

У пасляваенныя гады ў Заходняй Еўропе ўзнік фашысцкі рух. Спачатку ***фашызм*** перамог у Італіі. Але найбольш радыкальная разнавіднасць гэтай ідэалогіі — ***нацыянал-сацыялізм*** — замацавалася ў Германіі. Насельніцтва гэтай краіны, прыніжанае і абражанае артыкуламі Версальскага мірнага дагавора, даверыла сваю будучыню палітычным авантурыстам. Другая сусветная вайна, якая пачалася як вайна імперыялістычная, стала найбольш яскравай праявай крызісу індустрыяльнага грамадства і ў цэлым заходняй цывілізацыі.

**Сусветны эканамічны крызіс.** Пасля Першай сусветнай вайны заходнія дзяржавы сутыкнуліся са мноствам складаных праблем. Але ніводная з іх не была такой цяжкай,

Правообладатель Издательский центр БГУ




Помнік Вялікай дэпрэсіі. Вашынгтон (ЗША)

як *Вялікая дэпрэсія*, якая пачалася з краху на Нью-Ёркскай біржы ў кастрычніку 1929 г. Гэта быў самы глыбокі і самы разбуральны па сваіх наступствах эканамічны крызіс.

Эканоміка была адкінута да ўзроўню пачатку XX ст. Захад выпрабаваў некалькі варыянтаў выйсця з крызісу. ЗША рашуча адмовіліся ад эканамічнага лібералізму і пачалі праводзіць новы курс, адкрыўшы шлях дзяржаўнаму ўдзелу ў эканоміцы. Па аналагічным шляху, хоць і не так паслядоўна, пайшла Вялікабрытанія. Францыя правяла цэлую серыю прагрэсіўных рэформаў, але палітычная нестабільнасць замінала эканамічнаму ўздыму. Асноўныя краіны Захаду з розная хуткасцю і ў рознай ступені выйшлі з дэпрэсіі, аднак поўнае аднаўленне эканомікі так і не было дасягнута да Другой сусветнай вайны. У адрозненне ад фашысцкіх рэжымаў заходнія дэмакратыі здолелі выйсці з крызісу, захаваўшы свае дэмакратычныя заваёвы.

**Расія.** У стомленай ад вайны Расіі ў 1917 г. спачатку адбылася буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, а затым сацыялістычная. У выніку на карце свету замест разбуранай Расійскай імперыі з'явілася новая дзяржава — *Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР)*, альбо *Савецкі Саюз*. Савецкая мадэль мадэрнізацыі стала варыянтам развіцця, альтэрнатыўным тым, што рэалізоўвалі заходнія дэмакратыі і фашысцкія рэжымы. Ажыццёўленая за кошт унутраных рэсурсаў індустрыялізацыя дазволіла СССР выйсці на адзін узровень з развітымі краінамі свету і выстаяць у самай кровапралітнай вайне супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў.

Для Беларусі гэта быў перыяд нацыянальнага і культурнага ўздыму, афармлення і стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці. Да пачатку Другой сусветнай вайны БССР у складзе Савецкага Саюза ператварылася ў аграрна-індустрыяльную рэспубліку з дастаткова вялікай доляй пісьменнага насельніцтва. Найважнейшай падзеяй стала ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г. Пасля нападу фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз народ Беларусі ўзяў актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкім агрэсарам.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**За межамі еўрапейскага свету.** У першай палове XX ст. краіны Усходу і Лацінскай Амерыкі сталі арэнай дэмакратычных і нацыянальна-вызваленчых рэвалюцый і рухаў. У Мексіцы, Кітаі і Турцыі ўсталяваўся рэспубліканскі лад.

У многіх калоніях і паўкалоніях еўрапейскіх дзяржаў узмацнілася барацьба за нацыянальную незалежнасць. Аднак найбольшага ўздыму ***нацыянальна-вызваленчыя рухі*** дасягнулі пасля Другой сусветнай вайны. Яго вынікамі сталі вызваленне многіх народаў ад каланіяльнай залежнасці і здабыццё імі ўласнай дзяржаўнасці.

1. Які перыяд называюць навейшай гісторыяй? Назавіце падзею, якая адзначыла мяжу паміж новай і навейшай гісторыяй.
2. Дайце сціслую характарыстыку асноўным этапам навейшай гісторыі.
3. Вылучыце асноўныя напрамкі гістарычнага развіцця краін Захаду ў першай палове XX ст.
4. Дакажыце, што Першая сусветная вайна стала праявай крызісу індустрыяльнага грамадства і ў цэлым заходняй цывілізацыі.
5. Якія варыянты гістарычнага развіцця абазначыліся пасля Першай сусветнай вайны? Складзіце адпаведную схему.
6. Вызначце асаблівасці развіцця краін Усходу і Лацінскай Амерыкі ў XX ст.

**З працы расійскага гісторыка А. І. Уткіна «Першая сусветная вайна»**

Першая сусветная вайна з’яўляецца адной з ключавых падзей сусветнай гісторыі… Яна вывела на арэну грамадскага жыцця масы народу, якія фактычна не ўдзельнічалі раней у сусветнай гісторыі. Яна дала надзвычайны імпульс тэхнічнай рэвалюцыі. Яна пры гэтым адкрыла небывалыя глыбіні гуманітарнага падзення, на якое быў здольны чалавек насуперак усім дасягненням цывілізацыі. Яна фактычна разбурыла аптымістычную культуру Еўропы, скамячыла ўсе дасягненні стагоддзя паслянапалеонаўскага свету, зрабіла насілле легітымнай прыладай вырашэння міжнародных спрэчак і інструментам сацыяльных перамен. Яна пакінула пасля сябе надзвычайнае азлабленне народаў, якое вылілася ў адчужэнне 20—30-х гадоў і крывавую драму Другой сусветнай вайны.

*Якую ролю ў гістарычным развіцці свету, на думку расійскага гісторыка, адыграла Першая сусветная вайна? Ці можна яе разглядаць як гуманітарную катастрофу? Якія наступствы яна мела?*

Правообладатель Издательский центр БГУ